в единую монопольную систему по производству игровых фильмов. Что привело к большему сокращению штата. А зритель, в свою очередь, находясь в поиске удовлетворения своих духовных и эмоциональных потребностей — находит их в «иностранном кино».

**Литература**

1. Морен, Э. О природе СССР: Тоталитар. комплекс и новая империя / [Пер. с фр. А. В. Карлова, М. А. Чешкова; под общ. ред. А. С. Солоницкого. — М.: Науч.-изд. центр «Наука для о-ва»: Рос. гос. гуманит. ун-т, 1995. — 220 с.

2. Отчет о выполнении плана производства за 1986 г. / Белорусский государственный архив-музей литературы и искусства (БГАМЛИ). — ф. 112. — оп. 2. — д. 164.

3. План производства киностудии на 1991 г. / Белорусский государственный архив-музей литературы и искусства (БГАМЛИ). — ф. 112. — оп. 2. — д. 307.

4. Тематический план киностудии / Белорусский государственный архив-музей литературы и искусства (БГАМЛИ). — ф. 112. — оп. 2. — д. 232.

5. Соколов, К. Б. Социология искусства в XXI веке: смена парадигмы и новые пути // Теория художественной культуры / К. Б. Соколов. — 6 вып. — Москва: ГИИ, 2002. — 43 с.

## Канцэпт вайны ў творчасці М. Гарэцкага і Э. М. Рэмарка

*Кахавец А. В., студ. III к. БДУ,*
*навук. кір. ст. выкл. Супранкова Т. С.*

Славуты беларускі пісьменнік, у творчасці якога яскрава адлюстравалася ваенная тэматыка, Максім Гарэцкі нарадзіўся ў 1893 годзе ў сялянскай сям'і, з пачаткам Першай сусветнай вайны патрапіў на фронт. У адным з баёў пісьменнік атрымаў раненне і быў накіраваны ў шпіталь. У 1916 годзе, атрымаўшы званне прапаршчыка, зноў ідзе на перадавую. Аднак праз хваробу Максім Гарэцкі быў адпраўлены на лячэнне, а затым і ўвогуле звольнены з войска.

Шмат падобнага мы бачым таксама ў лёсе аднаго з самых вядомых і чытаемых нямецкіх пісьменнікаў дваццатага стагоддзя Э. М. Рэмарка, які нарадзіўся 22 чэрвеня 1898 года, выхоўваўся ў шматдзетнай сям'і і быў другім з пяцёх дзяцей. З самага дзяцінства будучы пісьменнік захапляўся творчасцю Ё. В. Гёте, Т. Мана, Ф. М. Дастаеўскага і інш. Аднак неўзабаве распачалася Першая сусветная вайна, якая аказала вялікі ўплыў на яго жыццё і творчасць. У 1916 годзе ён быў прызваны ў войска, а 17 чэрвеня накіраваны на Заходні фронт. У 1917 годзе пісьменнік быў паранены ў левую нагу, правую руку і шыю. Такім чынам, апошні год вайны Э. М. Рэмарк правёў у шпіталі.

Той жа лёс пройдуць іх галоўныя героі. Так, Пауль Боймер, таксама як і Лявон Задума, яшчэ маладым прызваны на вайну. Яны, яшчэ добра не зведаўшы жыцця, вымушаны ваяваць і забіваць. З адной школы юнакі трапілі ў другую, дзе яны ўжо не дзеці, а дарослыя, нават старыя. Вайна праходзіць праз усё жыццё галоўных герояў і гэта парадзіла такую з'яву як «малая вайна», вайна, якая адбывалася ў душы кожнага салдата. Гэта было звязана яшчэ і з тым, што з іх здзекваліся іх непасрэдныя начальнікі, якія ўвогуле ставіліся з пагардай да ўсяго чалавечага. Гэта было вельмі цяжка вытрымаць псіхалагічна, таму юнакі мараць адпомсціць за свае пакуты. Так, напрыклад, Пауль Боймер з сябрамі ўстроіў цёмную унтэру Хіммельштосу. Трэба адзначыць, што пісьменнікі вялікую ўвагу ўдзяляюць зменам, якія адбываюцца ў душы маладых салдат. Гэта рыса з'яўляецца прыкметай літаратуры «страчаннага пакалення», якую цікавілі не прычыны вайны ці яе ход, а тое, што яна робіць з чалавекам. Аднак трэба заўважыць, што М. Гарэцкага, хоць ён і вельмі блізкі да літаратуры гэтай плыні, нельга ў поўнай меры аднесці да яе. Гэта звязана з тым, што твор Максіма Гарэцкага быў напісаны раней, чым у літаратурнай традыцыі з'явілася азначэнне «страчаннага пакалення».

Е. Лявонава адзначае, што «значная частка ў літаратуры «страчаннага пакалення» надаецца выключна важнай ролі школы ў фарміраванні поглядаў маладых людзей, у мілітарызацыі і шавінізацыі грамадскіх настрояў»[1, с. 70]. У творы Э. М. Рэмарка школа разглядаецца ў якасці своеасаблівага пераходу маладых людзей да ваеннага жыцця і казармы з яе здзекамі, фізічнай і маральнай тыраніяй, знявагай да людзей. Трэба адзначыць, што разам з тэмай школы сваё развіццё атрымала тэма «бацькоў і дзяцей». Менавіта бацькі нясуць адказнасць за сваіх дзяцей, за іх фарміраванне як асобаў. Аднак у гэты цяжкі і складаны перыяд бацькі пад уплывам палітычнай сітуацыі падманваюць і навязваюць моладзі свае фетышы, вымушаюць гінуць на самым пачатку жыцця. Выключная роля надаецца ідэалогіі ў той ці іншай дзяржаве. Не ведаючы прычын вайны, моладзь ідзе на яе пад уплывам усё той жа палітычнай сітуацыі і прапаганды. Шмат юнакоў загінула, а тыя хто застаўся жыць, так і не змаглі знайсці сваё месца ў цывільным акружэнні. Нездарма Гертруда Стайн назвала іх прадстаўнікамі «страчаннага пакалення». Паказальным у гэтым выпадку з'яўляецца твор Э. М. Рэмарка «Тры таварышы», дзе апісваецца лёс сяброў, якія прайшлі праз усю вайну і якія спрабуюць жыць ужо не па яе законах. Але гэта не так проста, паколькі і зараз вайна праходзіць праз іх жыццё: сябры ўзгадваюць, як гінулі іх таварышы, яны не ведаюць, што такое каханне, паколькі на фронце верылі толькі ў баявых таварышаў. Паказальным таксама з'яўляецца вобраз графа Арлова, які збялеў, калі пачуў шум машыны, таму што пад такі шум быў расстраляны яго бацька ў Расіі. Пісьменнікі надаюць немалаважнае значэнне і апісанню вайны. Яна паказана вельмі рэалістычна і рознабакова. Напрыклад, эпізод, калі Пауль Боймер убачыў труп французскага салдата, ці лепей сказаць тое, што ад яго засталося, калі ён бачыў, як гінуць маладыя навабранцы, якія нават не прайшлі падрыхтоўку.

Лявон Задума таксама уражаны жахлівай карцінай, шматлікімі забойствамі і марадзёрствамі. Абодва галоўныя героі адчуваюць велізарны псіхалагічны ціск, таму што яны з'яўляюцца не толькі сведкамі тых страшэнных падзей, але і іх непасрэднымі ўдзельнікамі. Яны таксама забіваюць людзей, якія маюць сям'ю і не зрабілі ім нічога кепскага. Лявон і Пауль адчуваюць душэўны боль і сваю адказнасць за гэтыя ўчынкі. Паказальным з'яўляецца эпізод, калі галоўны герой Э. М. Рэмарка забівае французскага салдата Жерара Дзюваля і знаходзіць фотаздымкі яго сям'і. Ён абяцае, што пасля вайны будзе клапаціцца пра яе і больш не будзе забіваць, але як толькі Пауль трапляе назад да сваіх, ён працягвае ваяваць, забыўшыся на свае абяцанні. Падобным таксама з'яўляецца эпізод у творы Максіма Гарэцкага «Рускі», калі галоўны герой сутыкнуўся з аўстрыйцам. Спачатку яны павялі сябе зусім не як ворагі, але пасля «рускі», узгадаўшы хто ён, забівае аўстрыйца. Таксама, як і ў выпадку з Жерарам Дзювалем, узгадваецца сям'я і дзеці загінуўшага. Трэба адзначыць, што развіццё гэтага матыву знойдзе сваё адлюстраванне і ў далейшай літаратурнай традыцыі (у Васіля Быкава у «Адной ночы»). Гэтыя падзеі прывялі да таго, што Пауль і Лявон пачынаюць гаварыць пра бессэнсоўнасць вайны. Тут і зараджаецца матыў «справядлівай вайны», калі юнакі разважаюць, што вайна была б куды больш справядлівай, калі б на арэну ваенных падзей прышлі яе непасрэдныя распачынальнікі.

Галоўны твор Э. М. Рэмарка на мове арыгіналу называецца «Im Westen nichts Neues». Неабходна звярнуць увагу на значэнне слова «Westen». Яго можна перакласці не толькі як «Заходні фронт», але і «Захад» увогуле. Такім чынам, праблемнае кола твору значна пашыраецца: аўтар звяртае ўвагу не толькі на лёс маладых салдат, але і на лёс Захаду, ці лепей сказаць, Еўропы. Можна прасачыць яе немінучае падзенне, якое прыспешыла дзейнасць людзей. Вядома, што ў дзевятнаццатым стагоддзі было зроблена шмат вынаходніцтваў, якія не толькі значна палепшылі становішча тагачаснага грамадства, але і прывялі да першай сусветнай катастрофы. Так, на франтах Першай сусветнай вайны з'явіліся танкі, падводныя лодкі, дырыжаблі, быў прыменены газ. Цывілізацыя Еўропы пастунова расце, узбуйняецца і тым самым прыводзіць да заняпаду культуры. Гэта праблема знайшла сваё адлюстраванне ў кнізе О. Шпенглера «Захад Еўропы». Аўтар гаворыць, што дзейнасць людзей прыводзіць да катастрафічных вынікаў, адным з іх з'яўляецца Першая сусветная вайна. Такім чынам, яе можна разглядаць у якасці каталізатара паступовага разлажэння Еўропы, яе культуры, гібелі імперый і старога парадку.

Творы М. Гарэцкага таксама маюць шырокі спектар праблем. Так аўтар паказвае не толькі цяжкі працэс адаптацыі цывільнага чалавека і яго станаўленне як асобы ва ўмовах вайны, але і ролю беларусаў у гэтай вайне імперый. Вядома, што у Першай сусветнай вайне прынялі ўдзел Германская, Аўстрыйская, Асманская і Руская імперыі. Галоўны герой твора М. Гарэцкага даволі часта думае пра гэта,

нездарма аўтар назваў яго Лявон Задума. Ён часта разважае пра лёс свайго народу, пра развіццё культуры на беларускіх землях, пра ролю Беларусі ў гэтай вайне паміж магутнымі імперыямі. Перад паходам на Сербію, братэрную Рускай імперыі краіну, Лявон задаўся пытаннем: навошта ім туды ісці, што гэта дасць яго роднай Беларусі. Але што можа зрабіць чалавек, калі ён з'яўляецца проста марыянеткай у руках моцных гэтага свету, калі ён вымушаны змагацца не за радзіму, а дзейнічаць у інтарэсах імперыі. Першая сусветная вайна прывяла да краху усіх гэтых імперый. Беларускі народ змог хоць і не надоўга адчуць палёгку. Ён нават пачаў змагацца за сваю незалежнаць і здолеў дабіцца поспеху ў гэтай справе: была ўтворана БНР, хоць і ва ўмовах нямецкай акупацыі.

Такім чынам, мы бачым, што канцэпт вайны знайшоў сваё адлюстраванне ў творчасці як нямецкага, так і беларускага пісьменнікаў. Галоўныя творы аўтараў «На Заходнім фронце без перамен» і «На імпералістычнай вайне» маюць падобную структуру і паказваюць нам вайну такой, якой яна ёсць. Галоўныя героі, трапіўшы на фронт, праходзяць падобныя выпрабаванні, душэўныя пакуты, адчуваюць сваю адказнасць за ўдзел у гэтых падзеях. Пауль і Лявон, атрымаўшы раненне, трапляюць у шпіталь, а затым на некаторы час дадому. Пасля галоўны герой Э. М. Рэмарка гіне, а Лявон застаецца жыць. Падабенства твораў сведчыць пра тое, што пісьменнікі, якія ваявалі на франтах Першай сусветнай вайны, уклалі ў галовы сваіх герояў тыя падзеі, разважанні, перажыванні, пачуцці, думкі, карціны вайны, якія самі бачылі і перажылі, паколькі вайна прайшла праз усё іх жыццё. Аўтары вялікую ўвагу звяртаюць не столькі на апісанне вайны, як на станаўленне маладога пакалення пад яе ўлывам. Трапіўшы на фронт у васемнаццаць гадоў, юнакі прайшлі праз шматлікія выпрабаванні вайны і, як вынік, зразумелі паняцці «малой вайны» і «справядлівай вайны». Таксама трэба адзначыць, што выключная роля ў фарміраванні поглядаў маладога пакалення належыць ідэалогіі, школе і бацькам. Пад уплывам вайны адбываецца пераасэнсаванне ўжо існуючых і фарміраванне індывідуальных каштоўнасцей маладога пакалення, якія абумоўлены падзеямі вайны, іх псіхалагічным і ўнутраным станам. Аднак, акрамя гэтага, зараджаецца вельмі важная для чалавецва ідэя, якая іграе выключную ролю менавіта ў гэтым перыядзе,— ідэя братэрства народаў.